ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 18 (691) | Аўторак, 24 мая 1988 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.



НА ЗДЫМКУ: галоўны корпус універсітэта.

## СПЕЦВЫПУСК ГАЗЕТЫ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ-88

## У НАШЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ РЫХТУЮЦЦА СПЕЦЫЯЛІСТЫ ПА 12 СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ. ВЫБІРАЙЦЕ ДЛЯ СЯБЕ ЛЮБУЮ

**НА ДЗЕННЫМ АДДЗЯЛЕННІ:**

1. БЕЛАРУСКАЯ І РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА.
2. РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА.
3. ГІСТОРЫЯ.
4. БІЯЛОГІЯ.
5. ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА.
6. ЭКАНОМІКА І САЦЫЯЛОГІЯ ПРАЦЫ.
7. ЭКАНАМІЧНАЯ ІНФАРМАТЫКА І АЎТАМАТЫЗАВАНЫЯ СІСТЭМЫ КІРАВАННЯ.
8. БУХГАЛТАРСКІ УЛІК, КАНТРОЛЬ І АНАЛІЗ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ.
9. МАТЭМАТЫКА.
10. ФІЗІКА.
11. ГІДРАГЕАЛОГІЯ І ІНЖЫНЕРНАЯ ГЕАЛОГІЯ.
12. ГЕАФІЗІЧНЫЯ МЕТАДЫ ПОШУКУ І РАЗВЕДКІ РАДОВІШЧАЎ КАРЫСНЫХ ВЫКАПНЯЎ.

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

## АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА ДЗЁННАЕ АДДЗЯЛЕННЕ НА 1988—89 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

на наступныя спецыяльнасці:

**беларуская і руская мова і літаратура; руская мова і літаратура; гісторыя; біялогія; фізічная культура; эканоміка і сацыялогія працы; эканамічная інфарматыка і аўтаматызаваныя сістэмы кіравання; бухгалтарскі ўлік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці; матэматыка; фізіка; гідрагеалогія і інжынерная геалогія; геафізічныя метады пошуку і разведкі радовішчаў карысных выкапняў.**

На спецыяльнасці **«фізіка», «матэматыка» і «біялогія»** дакументы прымаюцца на педагагічнае і вытворчае аддзяленні.

На педагагічныя спецыяльнасці прымаюцца, як правіла, асобы, якія маюць схільнасць або вопыт работы з дзецьмі, па рэкамендацыях педагагічных саветаў школ, сярэдніх прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, органаў народнай адукацыі, працоўных калектываў, гарадскіх і раённых камітэтаў камсамола, ваеннаслужачыя, звoленыя ў запас на працягу трох апошніх гадоў.

Прыём заяў **з 25 чэрвеня па 15 ліпеня.** Уступныя экзамены **з 16 па 30 ліпеня.** Залічэнне ў састаў студэнтаў **з 1 па 5 жніўня.**

Паступаючыя ва універсітэт здаюць уступныя экзамены ў залежнасці ад выбранай спецыяльнасці па наступных дысцыплінах:

— **беларуская і руская мова і літаратура** — па беларускай мове і літаратуры (пісьмова), рускай мове і літаратуры (сачыненне), гісторыі СССР (вусна);

— **руская мова і літаратура; гісторыя** — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), па рускай мове і літаратуры (пісьмова), гісторыі СССР (вусна);

— **эканоміка і сацыялогія працы; бухгалтарскі ўлік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці** — па матэматыцы (пісьмова), рускай мове і літаратуры (сачыненне), гісторыі СССР (вусна);

— **эканамічная інфарматыка і аўтаматызаваныя сістэмы кіравання; матэматыка; фізіка; гідрагеалогія і інжынерная геалогія; геафізічныя метады пошуку і разведкі радовішчаў карысных выкапняў**— па матэматыцы (пісьмова), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры (сачыненне);

— **біялогія** — па біялогіі (пісьмова), хіміі (вусна), рускай мове і літаратуры (сачыненне);

— **фізічная культура** — па спецыяльнасці (лёгкая атлетыка, гімнастыка, плаванне) біялогіі (пісьмова), рускай мове і літаратуры (сачыненне).

Паступаючыя на ўсе спецыяльнасці, акрамя філалагічных, могуць пісаць сачыненне па беларускай мове і літаратуры.

Асобы, узнагароджаныя па заканчэнні сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём, закончыўшыя сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы і сярэднія прафесіянальна-тэхнічныя вучылішчы з дыпломам з адзнакай, здаюць адзін з устаноўленых адпаведнай спецыяльнасці ўступных экзаменаў, а іменна:

— **беларуская і руская мова і літаратура; руская мова і літаратура; гісторыя** — па рускай мове і літаратуры (сачыненне);

— **біялогія, фізічная культура** — па біялогіі (пісьмова);

— **матэматыка; фізіка; эканоміка і сацыялогія працы; эканамічная інфарматыка і аўтаматызаваныя сістэмы кіравання; бухгалтарскі ўлік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці; гідрагеалогія і інжынерная геалогія; геафізічныя метады пошуку і разведкі радовішчаў карысных выкапняў** — па матэматыцы (пісьмова).

Пры атрыманні адзнакі «пяць» яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў і залічваюцца ва універсітэт, а пры атрыманні адзнакі «чатыры» або «тры» здаюць астатнія экзамены.

Уступныя экзамены праводзяцца па праграмах, складзеных у адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі сярэдняй агульнаадукацыйнай школы і зацверджанымі Дзяржаўным камітэтам народнай адукацыі СССР.

**Заўвага:** пісьмовы экзамен (не ўлічваючы сачынення і матэматыкі) прадугледжвае пісьмовы адказ на пытанні экзаменацыйнага білета.

Залічэнне ва універсітэт праводзіцца па колькасці балаў, набраных паступаючымі на ўступных экзаменах.

Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах ва універсітэт залічваюцца ваеннаслужачыя, звoленыя ў запас і маючыя ўстаноўленыя ўрадавыя льготы, дзеці-сіраты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў.

У сувязі з вострай патрэбай у педагагічных кадрах шэрагу раёнаў Магілёўскай (Клімавіцкі, Краснапольскі, Слаўгарадскі, Касцюковіцкі, Чэрыкаўскі) і Гомельскай (Брагінскі, Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі, Добрушскі, Ельскі, Кармянскі, Нараўлянскі, Хойніцкі, Чачэрскі) абласцей Міністэрства народнай адукацыі БССР дазволіла залічваць па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах асоб, якія пражываюць ва ўказаных раёнах і маюць накіраванні раённых аддзелаў народнай адукацыі.

Пры роўнасці конкурсных балаў пераважнае права на залічэнне атрымліваюць ваеннаслужачыя, звoленыя ў запас на працягу трох апошніх гадоў; асобы, якія праявілі здольнасці і схільнасці да выбранай спецыяльнасці, найбольш падрыхтаваныя да навучання ў ВНУ; тыя, хто мае стаж практычнай работы больш двух гадоў.

Аб'яўляецца мэтавы прыём на педагагічныя спецыяльнасці асоб, пастаянна пражываючых у сельскай мясцовасці. Універсітэту даведзены наступны план мэтавага прыёму:

— **руская мова і літаратура:** Буда-Кашалёўскі— 2, Веткаўскі — 3, Гомельскі — 4, Добрушскі — 2, Жлобінскі — 2, Кармянскі — 2, Лельчыцкі — 2, Лоеўскі — 3, Акцябрскі — 1, Петрыкаўскі — 3, Рэчыцкі — 2, Рагачоўскі — 2, Чачэрскі — 2;

— **беларуская мова і літаратура:** Буда-Кашалёўскі — 1, Веткаўскі — 2, Гомельскі — 2, Добрушскі — 1, Жлобінскі — 1, Лоеўскі — 1, Рэчыцкі — 2; Магілёўская вобласць — 5: Бабруйскі — 1, Горыцкі — 1, Глускі — 1, Слаўгарадскі — 1, Шклоўскі — 1;

— **гісторыя:** Брагінскі — 1, Буда-Кашалёўскі— 2, Веткаўскі — 2, Гомельскі — 2, Жыткавіцкі — 1, Жлобінскі — 2, Калінкавіцкі — 2, Лельчыцкі— 1, Лоеўскі — 1, Акцябрскі — 2, Петрыкаўскі — 1, Рэчыцкі — 1, Рагачоўскі — 1, Хойніцкі — 1; Магілёўская вобласць — 2: Бабруйскі — 1, Кіраўскі — 1;

— **матэматыка:** Буда-Кашалёўскі — 2, Веткаўскі — 3, Гомельскі — 2, Добрушскі — 1, Жлобінскі — 1, Лоеўскі — 3, Рэчыцкі — 1, Чачэрскі— 2;

— **фізіка:** Брагінскі — 1, Веткаўскі — 2, Гомельскі — 2, Ельскі — 2, Калінкавіцкі — 1, Нараўлянскі — 1, Рэчыцкі — 1;

— **біялогія:** Брагінскі — 1, Буда-Кашалёўскі— 2, Веткаўскі — 3, Ельскі — 1, Жлобінскі — 1, Калінкавіцкі — 1, Лельчыцкі — 1, Лоеўскі — 1, Нараўлянскі — 1, Петрыкаўскі — 2, Рэчыцкі — 1, Рагачоўскі — 2;

— **фізічная культура:** Брагінскі — 1, Буда-Кашалёўскі — 2, Веткаўскі — 1, Гомельскі — 2, Добрушскі — 1, Ельскі — 1, Жлобінскі — 1, Кармянскі — 2, Лельчыцкі — 2, Лоеўскі — 2, Акцябрскі — 1, Рэчыцкі — 1, Рагачоўскі — 3, Хойніцкі — 2.

Мэтавыя накіраванні выдаюцца раённымі аддзеламі народнай адукацыі.

Заявы аб прыёме падаюцца на імя рэктара універсітэта. Да заявы прыкладаюцца: дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале, характарыстыка з апошняга месца работы або вучобы, выпіска з працоўнай кніжкі (для тых, хто мае стаж работы), медыцынская даведка па форме № 086/у, 6 фотакартак размерам 3×4 (здымкі без галаўнога ўбору), рэкамендацыя педагагічнага савета школы, сярэдняга прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча, сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы, органаў народнай адукацыі, працоўнага калектыву, гарадскога або раённага камітэта камсамола (паступаючых на педагагічныя спецыяльнасці). Пашпарт і дакумент аб адносінах да воінскай павіннасці паступаючыя прад'яўляюць у прыёмную камісію асабіста па прыбыцці ў ГДУ.

Усе пытанні, звязаныя з прыёмам ва універсітэт, канчаткова вырашаюцца прыёмнай камісіяй.

Дакументы накіроўваць па адрасу: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 108, Гомельскі дзяржуніверсітэт, прыёмная камісія.

Яўка на ўступныя экзамены па выкліку універсітэта. Прыёмная камісія знаходзіцца ў вучэбным корпусе № 1, тэл. 57-11-15.

**ПРЫЕМНАЯ КАМІСІЯ.**

